Газета заснавана ў 1931 годзе. Адноўлена ў 1999 годзе.

Голас Пружаны

№ 7 (7)
Пятніца,
13 -19
кастрычніка
2000 года

Штотыднёвая незалежная грамадска-палітычная газета

Кошт свабодны

2 старонка — ОБРАТНАЯ СТОРОНА МЕДАЛИ, или истории из жизни многодетной семьи

3 старонка — СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ. Шляхам свабоды

4 старонка — ДЛЯ ВАС, РОДИТЕЛИ. Мой ребёнок – первоклассник!

Великий праздник Покрова Пресвятой Богородицы

«...Я поверил от рожденья в Богородицын Покров»

Елена Адамчук

В начале10 века, в царствование Льва-VI Философа, сарацины вторглись в пределы Греческой империи, и успехи их оружия были несомненны, так как ощутителен уже был упадок в самой Греции. Благочестивые греки, твёрдо помнившие, что от Заступницы Небесной всегда получали помощь, прибегали к Ней и в настоящей опасности в молитве и покаянии. Видимое знамение Её милосердия подкрепило упование на Её заступление.

Во Влахернском Констатинопольском храме, где хранилась риза Богородицы, во время всенощного воскресного бдения Пречистая Дева явилась на воздухе молящеюся о мире, окружённою ликами ангелов, пророками и апостолами и осеняющею Своим покровом христиан. Не все присутствовавшие сподобились этого видения; но св. Андрей Юродивый видел это чудо и спросил своего ученика, праведного Епифания: «Видишь ли, брате, Царицу и Госпожу всех, молящуюся о всём мире?» «Вижу, святый отче, и ужасаюся», - отвечал Епифаний. Жители Константинополя, услышав о сем чуде, исполнились радости и упования, что Бог по ходатайству Заступницы рода христианского избавит их от бед, нанесённых вторжением неприятелей в их страну. Упование было не ложно: враги Церкви Христовой были вскоре побеждены и прогнаны. Это произошло в 911г. Честь установления этого праздника принадлежит Российской Церкви, которая с самого начала вверилась Покрову Богородицы.

Великий праздник Покрова Пресвятой Богородицы, приходящийся на 14 октября, - один из самых чтимых в народе. Этот день – граница между осенью и зимой. Именно с этой даты начинали отсчёт зимнего времени года. Можно предположить, что поскольку Покров Пресвятой Богородицы напоминает свадебное покрывало, праздник считался покровителем браков. С Покрова обычно играли свадьбы. В этот день во многих местах начинались Покровские ярмарки, торги.

В это время рачительные хозяева начинают утеплять дом на зиму, приваливают завалинки, конопатят пазы мхом или паклей, промазывают рамы, - «загоняют тепло». Говорили: «Захвати тепло до Покрова. Чини шубу до Покрова – не то не будет тепла». Хозяйки, затапливая печь, приговаривают особые слова: «Батюшка-Покров, натопи нашу хату без дров». В этот день – в первый праздник холода – пекли блинцы (тонкие блины), «запекали углы», чтобы из жилища тепло не выдувало.

Считается, что если на Покров истопить печь яблоней, то в доме всю зиму будет тепло. К этому празднику всё в избе мыли, убирали, чистили, наводя порядок. Покров также - последний день сбора плодов и грибов (груздей и рыжиков). Готовили угощения из плодов нового урожая, варили мёд, брагу.



Белорусская иконопись "Покров" XVIII век

Павлюсюк В.Л.

История про дядю из Австралии, или о нашем сервисе

Недавно я услышал историю про дядю из Австралии, который решил навестить свою историческую Родину через 40 лет. Уроженец села Крыница. Представляете, эта «деревенщина» боялся вечером в Пружанах войти в неосвещённый подъезд. Дядя из Австралии спрашивает: « Вы, что не платите за коммунальные услуги?» - «Платим». – «А почему свет в подъезде не горит?»

Настоящий австралийский абориген. Пугается того, что является нормой жизни для нас. Если бы он остался в родной деревне, до сих пор бы копал картошку мотыгой и за бутылку самогона просил бы у соседа коня. Вывод: жить в Австралии, значит, не дружить с головой – сознание меняется.

С Европой тяжелее – параллели одинаковы, сервис разный. Единственное оправдание, что в отличие от нас, они целых 70 лет не строили светлое будущее. Когда рухнула Берлинская стена, наши люди узнали, что звёздочками можно отмечать не только заслуги перед компартией и качество коньяка, но и уровень сервиса, отелей.

Я в Австралии не был – ну, не попал в сборную на Олимпиаду. И тут в десятилетие падения Берлинской стены, у меня в доме сгорает в счётчике гнездо, куда вкручивают пробки, и там, я не разбираюсь, ещё какие-то жучки не то ставят, не то живут они там. Короче после вспышки в счётчике, я не растерялся, живу в центре Европы, есть телефон. Звоню в электросеть: «Беда, сижу без света, приезжайте, выручайте».

-Что случилось? – голос диспетчера.

- Счётчик сгорел.

- Частный дом?

- Да. – Хотя подумалось: какая разница.

- Мы такую неисправность не устраняем, ищите знакомого электрика, и он вам всё сделает. – Тот же баритон сообщил номер своей бухгалтерии. Звонок туда убедил меня, я имею дело, несмотря на то, что в ответ услышал женский голос, с очень компетентными людьми, которые пояснили мне, тупому, не разу не бывшему в Австралии, что такая неисправность устраняется собственными силами, под напряжением, а если сами не «могёте», ищите знакомого электрика.

P.S. Вопрос был решён собственными силами. Остальным сообщаю, что вызов «знакомого электрика» стоит: бутылка «синекой» дороговато, а бутылка «вернисажа» маловато, золотая середина – бутылка самогонки. И не один налоговый инспектор за такой ненавязчивый сервис не взыщет в казну государства ни рубля налога.



НАВІНЫ

МАГІЛЁЎСКІ ВЫКАНКАМ ЗМАГАЕЦЦА З КРАДЗЯЖАМІ Ў ШКОЛЬНЫХ СТАЛОЎКАХ

Пры магілёўскім аблвыканкаме нядаўна была створана рабочая група «па кантролі за харчаваннем дзяцей у школах». Стварэнне падобнай ініцыятывы было выклікана шматлікімі парушэннямі, якія сустракаюцца ў школьных сталоўках: бруд, крадзяжы прадуктаў, дрэнная якасць страў, малыя порцыі. Аблвыканкам даручыў камісіі пад кіраўніцтвам Дзьмітрыя Сівіцкага ліквідаваць недахопы. Праўда, наіўна меркаваць, што праблему можна вырашыць адно толькі адміністратыўнымі мерамі.

ПАДАЗРОНАЯ ТРЫВАЛАСЦЬ

Жыхары горада Шклова заўважылі, што тарыфы праезду ў дызель-цягніках ад Шклова да Магілёва і Воршы не зьмяняюцца ўжо доўгі час і складаюць 60 рублёў. Вядома, што на іншых адрэзках беларускай чыгункі квіткі даражэлі ўжо два разы. Гараджане звязваюць падобную трываласьць коштаў ці з дзіўнай праявай любові прэзідэнта да сваіх землякоў, ці з тым, што на гэтым участку размешчаныя лецішчы кіраўнікоў магілёўскага ўпраўлення чыгункі.

ФЭСТ ПАМЯЦІ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ ГЕРОЯЎ БЕЛАРУСКАГА ВЫЗВОЛЬНАГА РУХУ 1863-1864 ГГ.

Штогадовы ўсебеларускі фэст, прысвечаны памяці нацыянальных герояў беларускага вызвольнага руху 1863-1864гг. адбудзецца 22 кастрычніка ў м.Свіслач, што на Гарадзеншчыне. Ладзяць свята грамадскае аб»яднаньне імя братоў Каліноўскіх (м. Свіслач), аб'яднанне «Аслона» (г.Ваўкавыск), Гарадзенскае аддзяленне ГА «Фонд імя Льва Сапегі» і Гарадзенская філія Грамады (БСДГ). У межах фэсту адбудзецца ўскладанне кветак на магілу Каліноўскіх, святочны мітынг і шэсце. Пасля ўдзельнікі наведаюць вёску Якушоўка, дзе знаходзіцца былы маёнтак Каліноўскіх. Там адбудзецца ўрачыстае асвячэнне крыжа, усталяванага летась каля маёнтка. Потым адбудзецца канцэрт беларускіх бардаў, у тым ліку Віктара Шалкевіча, Зміцера Бартосіка, Андрэя Мельнікава і інш. Акрамя таго, на фэст запрошаны Уладзімер Арлоў, Рыгор Барадулін, Станіслаў Шушкевіч, прадстаўнікі палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў.

Свята пачнецца ў 11.00 у м.Свіслач на вуліцы Камсамольскай. Усе жадаючыя прыняць удзел у фэсце могуць звяртацца па тэлефонах:

(8-01512) 2-67-97,
2-67-46 у Ваўкавыску.



14 октября – День Матери

ОБРАТНАЯ СТОРОНА МЕДАЛИ,
или истории из жизни многодетной семьи

Вырастить ребёнка непросто, - это вам скажет любая мама. А когда их несколько: двое, трое, пятеро, шестеро...

Познакомиться с матерью-героиней Кологрив Татьяной Юрьевной, узнать о её радостях и трудностях мы отправились в д.Скорцы Пружанского района. 1 октября она получила почётную награду – Орден Матери. У Татьяны Юрьевны шестеро детей, старшей – 17 лет, младшей – 3 года.

Адамчук Л.



Кологрив Татьяна Юрьевна, и её семья

История первая: «Крыша дома моего».

Приехав в д. Скорцы, мы без труда отыскали неказистый домик под номером 12. Перед глазами открылась плачевная картина строения. Старая хатка, хоть и обложена кирпичом, была с недостроенной, дырявой крышей. Хозяйки не было дома, она работает дояркой, в это время находилась на ферме. Навстречу нам вышел её муж, хозяин дома Кологрив Пётр Алексеевич. Он и поведал историю ремонта своего дома.

Девять лет живут они в этой деревне, руководство совхоза «60 лет БССР» давно обещало отремонтировать этот совхозный дом. За это время поменялось несколько директоров совхоза, но особых улучшений в плане ремонта дома не было. В марте сего года администрация совхоза обещала отстроить дом до сентября и гулять новоселье. Но, как говорят, «воз и ныне там». Ремонт не закончен до сих пор. А уже холода грядут. «Каждое утро встаю и думаю, что же делать. В доме холод. Дети спят одетые. Недавно дождь был, так с «новой» крыши как потекло, залило телевизор, и чуть не привело к пожару», - рассказывает Пётр Алексеевич. "Куда ушли материалы, выделенные на этот дом в течение 9 лет?" - хотелось бы спросить у руководства совхоза.

Хозяин ещё делился своими проблемами: недавно перенёс серьёзную операцию – тяжёлым физическим трудом заниматься нельзя; целое лето не было зарплаты – выручали родители пенсионеры; крышу накрыли из старого шифера, снятого бог-весть, откуда, даже не подослав рубероид – вот такой ремонт.

А пока разговаривали, из окошка дома стали выглядывать детские лица.

История вторая: «Вынужденные каникулы».

На удивление, утром в будний день в доме находились дети школьного возраста. Спрашиваем: «Почему не в школе?» - отвечают: «Не возят». Оказывается, детей из д. Скорцы в д. Кобыловка (11 км) должны возить на совхозном автобусе. Но сейчас на автобус нет бензина, вот и сидят все школьники из д. Скорцы дома. Уже четыре дня сидят дома, но это ещё что, в прошлый учебный год и побольше времени не посещали школу из-за транспорта. Придут на остановку, постоят и уйдут.

«Раньше дети хорошо учились на четыре, пять, а теперь пошли сбои, тройки иногда появляться стали», - говорит отец. А старшая, из присутствующих детей, принесла новые спортивные брюки с большой дыркой. В машине, которая возит в школу, порвала. Машина грязная, страшная, на ней везут рабочих в Кобыловку, заодно и детей забирают. Но сейчас получается, и такого транспорта нет. Вынужденные каникулы?

История третья: «Мама и есть мама».

В дом вошла Татьяна Юрьевна Кологрив. Дети заулыбались. А самая маленькая из детей трёхлетняя Галечка бросилась к маме: «Ой, мама пришла». Обхватила её ручонками, прижалась к ней. Мы попросили Татьяну Юрьевну надеть Орден Матери и сфотографироваться. Симпатичная женщина застенчиво улыбнулась. Не привыкла она фотографироваться. Привыкла на ферме работать с 5 часов до 22 часов, да детей поднимать.

Двое старших уже учатся в швейном училище в г.Бресте. «Младшие учатся неплохо в школе, да нам помогают по дому, по хозяйству. Картошку перебирали, так даже маленькая Галя с нами, тоже перебирала», - рассказывает Татьяна Юрьевна. На вопрос о зарплате и о пособиях, она вздохнула, денег ведь хватает только на то, чтобы как-то свести концы с концами. - «Главное, чтобы дети были здоровы, чтобы выучились, нам помогали», - говорит Татьяна Юрьевна. Как и все мамы. Все Мамы хотят одного: чтобы их детям было хорошо, чтобы их дети были счастливы.

Три истории из жизни многодетной семьи. А за этими историями стоят детские лица, глядят детские глаза. Им не объяснишь, что руководство совхоза не выполнило своих обещаний, поэтому у них дома холодно; им не объяснишь, почему нет бензина в совхозе для того, чтобы отвезти их в школу, поэтому они пропускают занятия. Единственное, что им не надо объяснять - почему у их мамы по праздникам на груди висит такая почетная награда - Орден Матери.

Саламяная гісторыя



Валянціна Ляўчук

Алеся Субота

Выбраць падарунак блізкаму, суседу, ці калезе па працы, здаецца, не цяжка, былі б грошы. А вось калі Вас запросяць ў госці за мяжу - тут, напэўна, без галаўнога болю не абыйдзецца. Нават і з шырокай кішэняй можна зайсці ў тупік. А чаму б у такім выпадку не ўспомніць пра простую саломку, ці дакладней пра цудоўныя вырабы з яе?

Думаю, многія нё раз любаваліся саламянымі дзівосамі ў крамах. Яны ўжо доўгі час маюць славу лепшага беларускага сувеніра. Дык вось, празнаўшы пра тое, што па-суседству жыве жанчына, якая ўласнымі рукамі стварае гэты саламяны цуд, я адправілася да яе ў госці. Знаёмцеся - Валянціна Фёдараўна Ляўчук.

Яшчэ з вуліцы, глянуўшы на балкон, можна здагадацца чым займаецца гападыня кватэры, бо ў скрынях на балконе акуратна стрычыць жоўтая саломка. А пачыналася ўсё гадоў 12 назад. Працавала Валянціна Фёдараўна на нашым "славутым" заводзе радыёдэталей. Нарадзіўся сын Стасік, падрос, настаў час маме з дэкрэтнага адпачынку выходзіць, а месцаў у завадскім садку няма (справа была, як разумееце, яшчэ да дэмаграфічнага крызісу). Вось і вырашыла жанчына змяніць працу - стаць надомніцай і не абы дзе, а на філіяле Брэсцкай сувенірнай фабрыкі, што ўжо некалькі гадоў працаваў у Засімавічах. Так і засталася там і не шкадуе.

А спачатку было і расчараванне, і слёзы - не адразу паддалася саломка, не слухаліся рукі, хацелася ўсё кінуць. Ды і ўмоў у маленькім пакойчыку завадскога інтэрнату не было, а саломка была ўжо, здаецца, у кожнай дзірцы, нават і ў ложку калола бокі. Зараз жа ўсе гэтыя недарэчнасці ў мінулым: рукі спрытна і паслухмяна плятуць коскі, зубаткі, ланцужкі і іншыя загатоўкі да вырабаў. А вырабаў гэтых, дарэчы, на філіяле выконваюць каля 60-ці разнавіднасцей. Гэта карзінкі і падносы, вазы і латкі, цацкі, абручы і кветкі-ўсяго і не пералічыць.

У асноўным прадукцыя разыходзіцца па Беларусі, калі-некалі робяць спецзаказы да юбілеяў нашыя прадпрыемствы, напрыклад Брэсцкая ТЭЦ, Беларуская чыгунка, бываюць заказы і за мяжу. Падарункі блізкім, знаёмым, сябрам Валянціна робіць толькі сваімі рукамі. Здараецца і зусім не знаёмыя людзі прыходзяць з жаданннем нешта набыць. Тут ўжо прыходзіцца загатаўляць салому самой, а першы памочнік у гэтай справе 6-цігадовы сын Віця.

Як у кожнага добрага майстра, у Валянціны Фёдараўны ёсць свае вучні, дакладней вучаніцы, якія пасля падрыхтоўкі працуюць таксама на філіяле. Ганарыцца гераіні майго апавядання ёсць чым: вырабы яе працавітых рук радуюць вока ў Германіі і Іспаніі, Галандыі і Італіі, а зусім нядаўна яны перасяклі акіян. Справа ў тым, што родная сястра Валянціны Фёдараўны эмігрыравала ў Злучаныя Штаты, а ў якасці падарункаў, ды і проста на памяць аб Беларусі, павезла саламяныя сувеніры. Такім чынам, частка душы, якую несумненна ўкладвае кожны майстар у свае вырабы, жыве па ўсяму свету.

Сообщает ГАИ



***

В РТМО г. Пружаны 25 сентября поступило сообщение, что к ним доставлен и госпитализирован учащийся Б. подготовительного класса Поросlянской СШ. Военнослужащий Л., управляя личным автомобилем «Фольцваген-Джетта», на территории военного городка д. Н. Засимовичи совершил наезд на Б., внезапно выбежавшего из-за стоявшего автомобиля «Газель». В результате чего, Б. получил телесные повреждения в виде закрытого перелома правой большеберцовой кости со смещением.

***

10 октября в 18 ч. 10 м. гражданин С., работающий водителем Пружанского автопарка №11, управляя автобусом «Икарус», который следовал маршрутом «Пружаны-Засимовичи», на ул. Ленина совершил наезд на внезапно выбежавшую на проезжую часть учащуюся Г., ученицу 2 класса СШ №1. В результате наезда девочка от полученных телесных повреждений скончалась на месте. По данному факту возбуждено уголовное дело.

***

За текущий период 2000 г. за управление транспортом в состоянии алкогольного опьянения задержано 346 человек.

Курсы валют у банках г.Пружаны:

	купля	продаж
БелБізнесБанк		
$ ЗША	1051	1061
DM	463	472
RUR	37	38
Аграпрамбанк		
$ ЗША	1045	1055
DM	455	470
RUR	37	38
Беларусбанк		
$ ЗША	1051	1068
DM	455	464
RUR	37	38

Кошт паліва на гарадскіх АЗС:

АЗС "Пружаны"	
Ai-95	579
Ai-92	няма
Ai-76	няма
ДП	375
АЗС «Салют»	
Ai-95	няма
Ai-92	521
Ai-76	435
ДП	375

İ. Машкала

Шляхам свабоды

Пачатак ў 5 і 6 нумарах

Новая хваля русіфікацыі

Ва ўсіх губернскіх і павятовых гарадах Паўночна-Заходняга краю былі створаны часовыя камітэты па будаўніцтву праваслаўных цэркваў.

У Пружанах такі камітэт узначаліў сам ваенны начальнік горада і павета капітан Эліс.

Пад час паўстання ў Пружанах у 1863-84 г.г. існавалі Хрыстараждзественская (на месцы сучаснага універсама), Праабражэнская (на могілках) цэрквы, а таксама стары драўляны і новы, амаль што збудаваны, каталіцкія касцёлы.

Заўважыўшы імкненне пэўнай часткі насельніцтва горада перайсці ў каталіцызм, царскія чыноўнікі забралі вялізны будынак касцёла, пабудаванага па праекту вядомага архітэктара Марконі на сродкі прыхаджан і ўмышчаўшага адначасова больш тысячы чалавек, у падпарадкаванне паліцыі. Царскія ўлады не маглі дапусціць, каб гэты выдатны будынак, узвышаючыся над Пружанамі быў сімвалам каталіцызму, а для многіх і сімвалам незалежнасці ад царскай Расіі.

Ужо зімой, у канцы 1863 года, Пружанскі ваенны начальнік патрабуе ад прыхаджан каталіцкага касцёла, каб яны "добраахвотна", выказваючы сваё вернападданніцкія пачуцці да ўрада, аддалі свой недабудаваны касцёл. Запалоханыя рэпрэсіямі, пад маральным уціскам улад прыхаджане ставяць свае подпісы пад заранёў падрыхтаваным тэкстам, з якога вынікала, што будынак касёла добраахвотна перадаецца мясцовым уладам пад царкву, школу ці што іншае.

Вядома, што касцёл будваўся ў асноўным на сродкі памешчыка Швыкоўскага, які абвінавачваўся ва ўдзеле ў паўстанні, таму асобам, якія не мелі да будаўніцтва касцёла ніякага дачынення, падпісвацца пад адрачэннем не складала асаблівай цяжкасці. Але адначасова з гэтым многія католікі павінны былі перайсці ў праваслаўе, што было не так проста ажыццявіць. На гатае супраціўленне і наткнуліся мясцовыя ўлады. Пачаліся скаргі на перавод з каталіцызму ў праваслаўе сілай епархіяльным уладам. І ўсё ж за 1864 год у праваслаўе Пружанскім павеце было пераведзена 940 з 1812 чалавек.

Акрыленыя поспехамі царскія ўлады пачалі паўсюдна пад любымі матывамі закрываць касцёлы, перарабляючы іх у цэрквы. А калі няма касцёла - разважалі яны, то не будзе і каталікоў, а разам з гэтым не будзе і думкі аб своеасаблівасці Беларусі. Пад гэтай хваляй закрываюцца касцёлы ў вёсках Лыскава, Вялікім Сяле. Робіцца спроба закрыць касцёл у м. Сялец. Аб гатай кампаніі яскрава сведчаць архіўныя дакументы.

Так, прыбыўшы 20 сакавіка 1864 г. з Пружан у мястэчка Сялец, станавы прыстаў падпаручнік Антонаў загадаў тысяцкаму сабраць сход сялян для аб'яўлення цыркуляра Галоўнага начальніка края. Пры Антонаве знаходзіліся 10 салдат і трое казакоў, якія былі накіраваны з тысяцкім для хутчэйшага збору сялян на сход.


Пасля прачытання цыркуляра падпаручнік Антонаў зрабіў кароткае тлумачэнне прачытанага і прапанаваў добраахвотна прыняць праваслаўе.

Запалоханыя сяляне пачалі па чарзе падыходзіць да стала распісвацца, пакуль не дайшла чарга да селяніна Іосіфа Гурскага. Выйшаўшы з натоўпу, ён дзёрзка і з насмешкай сказаў: "Не, я не дам падпіску і ніхто не давайце падпісак". Сказанае Гурскім зрабіла вялікае ўражанне на прысутных сялян, якія адразу ж перасталі падпісвацца. Падпаручнік Антонаў, бачачы, што добра пачатай справе можа прыйсці канец, не стрымаўся і некалькі разоў ударыў па твары селяніна, ад чаго ў апошняга пацякла з носа кроў. Пасля гатага выпадку выйшаў з натоўпу яго родны брат Якаў Гурскі і звярнуўся да сялян з такімі ж словамі. На што Антонаў прыгразіў яго "вздуть нагайкой". Пасля гэтай пагрозы ўсе сяляне падпісаліся, у тым ліку і Гурскія. Затым увесь натоўп у суправаджэнні салдат павялі да царквы (куды ўвайшлі і салдаты), дзе і было зроблена ўсё неабходнае для пераходу ў праваслаўную веру.



Ю.Малышэўскі. Выцінанка

Калі праз тры дні павінны былі прыняць праваслаўе астатнія католікі навакольных вёсак, сабралася шляхта і аднадворцы, якія рэзка выступілі супраць гэтага пераводу. Сабраўшыся 25 сакавіка, яны нарабілі столькі шуму, што былі разагнаны салдатамі. Радуючыся першай маральнай перамозе над уладамі, жыхары м. Сялец сабраліся ў карчме, каб адзначыць гаты выпадак. А адзін з іх, Казімір Паследні, будучы ўжо на падпітку, пры ўсіх пачаў гаварыць: "Няхай рускі ўрад не думае, што мяцеж скончаны, у нас дух моцны". У гэты ж дзень было наісана пісьмо з прашэннем не пераводзіць сялян у праваслаўе і адпраўлена ў Вільню, другое такога ж зместу - мясцоваму благачыннаму І.Ячыноўскаму.


Беларуская карчма

Даведаўшыся пра гата, падпаручнік Антонаў прыехаў у Сялец, дзе арыштаваў двух сялян, а астатніх прымусіў насіць на раз'езд пясок і пасыпаць ім вуліцы.

Праводзячы палітыку русіфікацыі насельніцтва, пры дапамозе царскага ўрада за невялікі прамежак часу былі пабудаваны, перароблены з касцёлаў, капітальна адрамантаваны цэрквы ў Смалянах, Лыскаве, Рудніках, Мокрым, Аранчыцах, Хараве, Шарашове, Варанілавічах, Ружанах, Купліне, Засімавічах, Дубінах, Гарадзечне, Вежках, Байках і Пружанах.

Царскія чыноўнікі, праводзячы масавыя акцыі, не забывалі і людзей, якія асабліва ўпарта супраціўляліся гэтай палітыцы. Так мешчанін г.Пружаны Вакульскі за адмову перайсці ў праваслаўе неадназова накіроўваўся паліцыяй "для увещевания" ў Жыровіцкі і Барысаглебскі манастыры.

За хрышчэнне дзяцей па каталіцкаму абраду былі аддадзены пад суд мяшчане А. Макавецкі і Сіманові. А міравы пасрэднік Пружанскага павета Папоў у Шарашове гвалтам забраў у сялян летняе адзенне, прыгразіўшы, што не верне яго, калі іх дзеці будуць пахрышчаны ў касцёле.

Не толькі бізуном, але і пранікам прываблівалі ў праваслаўе чыноўнікі. Так мяшчанам г.Пружаны за пераход у праваслаўе з іудзейства выдавалася грашовая дапамога, а сяляне павета за пераход у праваслаўе вызваляліся ад павіннасцей на карысць ксяндза. Не толькі шляхта, але і сяляне разумелі, якія мэты ставіў царскі ўрад, праводзячы гэтую палітыку.

Так, жыхар в.Лясная Чэслаў Сербінецкі ў прыватнай размове з Восіпам Аржахоўскім сказаў, што "вяртацца ў праваслаўе не трэба. Гатага хочуць толькі бліжэйшыя начальнікі". Жыхар жа в.Буды У.П.Валадкевіч не на жарт напалохаў павятовае начальства, калі ў адказ на прапанову перайсці ў праваслаўе заявіў: "А вось спытаемся, калі будзе Гасудар у Белавежы на паляванні, ці праўда гэта".

Праводзячы дазнанне пасля сакавіцкіх падзей у Сяльцы, ваенны следчы адзначыў, што "сяляне, пражываючыя у в.Сялец Пружанскага павета, надзвычай развітыя, але настрой разуму ў гэтых сялян, далёка не благанадзейны, і цяпер памылкова рабіць заключэнне аб іх вернападданніцтве".

Нацыянальна-вызваленчы рух, які ахапіў і наш павет, быў жорстка падаўлены, але ён стаў адным з першых парасткаў народнай сталасці, імкнення змагацца за свае правы, свабоду, шчасце.

ЖЫВЕМ - ПАКУЛЬ ПОМНІМ







У мінулую нядзелю ля в.Ласісін адбылося асвячэнне аднаўленага па ініцыятыве Пружанскай Рады ТБМ помніка ўдзельнікам нацыянальна-вызваленчага паўстання 1863г.

На мітынгу-рэквіеме ўдзельнічала каля сотні жыхароў Пружанскага раёна і гасцей з Брэста і Мінску. Сярод іх навучэнцы школ і тэхнікума, прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў ТБМ, БНФ, "Грамадзянскі Форум", "Яравіт" (Пружаны), "Вежа" (Брэст), прадстаўнікі консульства Рэспублікі Польшча, а таксама Пружанскага райвыканкама і Брэсцкага аблвыканкама.

У цэрымоніі асвячэння прынялі ўдзел святары каталіцкай (Ружаны) і праваслаўнай (Варанілавічы) канфесій.







Для Вас, родители

Марина Шевченко, психолог

Мой ребёнок – первоклассник!

«То, что идёт от сердца, то до сердца и доходит»



Набирает ход новый учебный год. Многим ребятам приносит он новую радость познания, успеха и общения с одноклассниками. В этом смысле не позавидуешь первоклашкам. Ведь на них сваливается огромный груз ответственности после беззаботной дошкольной жизни. И даже в подготовительном классе всё ещё намного проще, потому что учёба напоминает игру, которая не оценивается отметками. Теперь ребятам, ещё не забывшим про игрушки, необходимо соответствовать требованиям, предъявляемым к ученику. А если не всегда получается, ребёнок испытывает сильнейший эмоциональный стресс. И именно мама и папа могут помочь своему недавнему малышу.

Учёные доказали, что нежелание родителей оказывать помощь своим детям или ошибки, допускаемые ими при попытке помочь, могут приводить к самым неприятным последствиям, в числе которых, одно из главных – появление стойкого нежелания учиться.

Конечно, учитель в школе делает огромную работу по формированию успешной учебной деятельности. Но его работа может быть сведена к нулю, если выполнение домашних заданий организовано неправильно или неорганизованно вообще. Вот тут, также как и когда-то в детстве родители учили малыша ходить, они как никто могут помочь ребёнку научиться учиться.

Что же зависит от умных и взрослых пап и мам?

Во-первых, очень важно с самого начала помочь ребенку выработать привычку к неукоснительному выполнению домашних заданий. И первым шагом к достижению этой цели может стать воспитание у детей подхода к урокам, как важному и серьезному делу, вызывающему уважительное отношение со стороны взрослых.

А ведь нередко встречаются семьи, где мама считает возможным прервать занятия сына или дочери, чтобы предложить им вынести мусорное ведро или послать в магазин за хлебом. Иной раз и папа предлагает отложить уроки, чтобы посмотреть интересную и насыщенную на его взгляд передачу. Бывает нелегко убедить родителей в том, что таким образом они воспитывают у школьника отношение к урокам, как маловажному и второстепенному делу.

Правильно поступают те родители, которые дают понять своему ребенку, что по своей важности уроки находятся на одном уровне с самыми серьезными делами, которыми заняты взрослые. Это удается при соблюдении двух условий.

Первое заключается в том, что ребёнок с раннего детства должен быть приучен к тому, что, когда родители заняты, им нельзя мешать. Если ребёнок научен уважать занятия других, то появление у него дела, которому никто не должен мешать, воспринимается им как должное.

Вторым условием, способствующим повышению значимости учёбы, является привитие в семье уважения к умственному труду. И, конечно, первоочередную роль снова играет личный пример родителей. Полезно небольшую часть своей работы выполнять дома по вечерам. Если это невозможно из-за особенностей своей профессии,- то на помощь может прийти такой приём: мама (папа), отметив на часах время (если ребёнок не умеет его определять – провести по стеклу циферблата фломастером черту), в течение которого сынишка и дочь не должны её или его беспокоить, могут заполнить это время просто чтением книги, журнала или газеты.

Важным моментом в деле выработки привычки к неукоснительности занятий является чёткое установление времени для них. Только исключительные обстоятельства могут стать причиной смещения начала выполнения домашней работы. Это очень важно потому, что для подавляющего большинства людей при необходимости выполнять малопривлекательное, но необходимое дело наиболее трудным является именно начальный период – период включения в работу. Уже потом, когда человек «втягивается» в неё, она выполняется без насилия над собой, часто даже с появившимся интересом.

Так вот, для любого человека, тем более для младшего школьника, определённое время начала уроков помогает период включения в работу сделать по максимуму коротким и облегчённым. Этому же помогает и тот момент, что ученик имеет своё постоянное место для выполнения уроков. Лучше всего, если у него будет свой стол. Если материально-бытовые условия не позволяют этого сделать, то у ученика на установленное время занятий должно быть выделено место за общим столом.

Очень важно также научить ребёнка не отвлекаться во время выполнения домашних заданий. Как правило, у ребёнка возникает два повода для отвлечения.

Первый из них – игра, в которую ребёнок может втянуться незаметно для себя, задев тетрадкой или книгой какую-нибудь игрушку. Второй повод – якобы деловой. Школьник может постепенно отвлекаться, чтобы заточить карандаш, вставить стержень в ручку, найти линейку и т. д. В любом из этих случаев процесс втягивания в работу прерывается, и его каждый раз приходится начинать сначала, с самого малоприятного момента.

Чтобы избежать этого следует завести чёткое правило: до начала занятий со стола должно быть убрано всё, что не имеет к ним отношения, и приготовлено всё, что нужно для работы.

И, конечно же, мама и папа не должны при выполнении вышеназванных рекомендаций превратиться в строгого контролёра или надзирателя. Важнее всего то, чтобы ребёнок ни на минуту не перестал чувствовать, что он любим, в него верят и делят с ним огорчения и радости самые близкие и родные люди

«Крыша поехала!»



Папа поучает сына:

- Запомни, сынок, умный человек всегда во всем сомневается. Только дурак может быть полностью уверенным в чем-то.
- Ты уверен в этом, папа?
- Абсолютно!

***

Сидят дед с бабкой за столом. Обедают. Бабка чавкает. Дед не выдерживает и бьёт ложкой бабке по лбу.
- За что?
- Не чавкай.

Бабка перестала чавкать. Дед опять бьёт её ложкой по лбу.
- За что?
- Как вспомню, аж бесит.

***

На хирургической операции:

Врач: - Вам какой наркоз - подороже или подешевле?

Больной: - Денег у меня немного, давайте самую дешевую.

Врач: - Ну ладно, давайте.

- Баю, баюшки, баю...

***

Бомж забрёл на дачу крутых, подходит к хозяйке и говорит:
- Мадам, сжальтесь, я уже целую неделю не видел мясного!
- Несчастный... Нюра, вынеси ему котлетку, пусть посмотрит!

***

- Что общего у всех мужчин, посещающих вечера для холостяков и незамужних?
- Все они женаты

***

В курятник входит утка и обращается к петуху:
- Скажите пожалуйста, где здесь пруд?

Петух:
- Уважаемая, прут в свинарнике, а здесь - топчут!

***

Когда я был еще совсем мальчиком, я убил в один вечер четырех бешеных собак!
- Папа, ты мне это рассказывал в прошлом году, но тогда собак было всего две.
- Правильно, сынок, ты был еще слишком мал, чтобы знать всю правду!

***

Вбегает муж домой и говорит жене:
- У нас через полчаса будут гости. Я начальника своего пригласил.

Жена:
- Ты что, с ума сошел? У нас же дома нечем угощать.
- Ну сообрази что-нибудь. Обязательно его надо принять, завтра будут решать, кому оклад прибавят.
- Ну у нас же нет ничего. Только суп для тебя да банка горошка.
- Так, слушай меня. Когда он придет, я скажу, что ты готовишь отбивные с горошком.



Я его пока здесь домашней наливкой угощу. А потом ты на кухне разбей тарелку, запричитай, я тебя спрошу, в чем дело, ты крикнешь, мол, уронила отбивные в помойку. Подашь горошек, делать нечего.

Короче, договорились, приходит начальник. Муж его в комнате угощает наливкой, потом кричит жене:
- Ну как там наши отбивные с горошком?

На кухне падают тарелки, грохот, причитания.

Муж:
- Ну что, криворукая? Неужто отбивные в помойку уронила?

Из кухни рыдания:
- Нет, горошек

***

Мужик читает на столбе объявление:

"Лечу от всех болезней".

Улыбается и говорит:
- Ни хрена, от всех не улетишь!

***

В шотландской полицейской школе молодого курсанта спрашивают:
- Что бы вы стали делать, если бы вам в одиночку пришлось разгонять демонстрацию?
- Я снял бы фуражку и стал бы собирать на благотворительные нужды

***

В целях борьбы с вредителями Министерство сельского хозяйства Китая объявило, что за каждую сданную саранчу будет выдан 1 юань.

Теперь все крестьяне разводят саранчу.

***

Встретились две подруги.
- Как ты похудела - восклицает одна.
- Мне изменяет муж - отвечает другая.-Я так страдаю.
- Так разведись с ним!
- Не могу, мне нужно сбросить ещё три кило

***

Семейный скандал.

Жена: - Лучше бы я умерла!

Муж: - Я тоже!

Жена: - Я тогда не хочу!!!



СПОРТ

Елена Адамчук

КРОСС

Осеннее Первенство района по кроссу в программе 9-х Юношеских игр среди школ г.Пружаны и Пружанского района состоялось 5 октября в городском парке. Отлично выступили спортсмены школ г.п.Шерешево и д.Линово. В общекомандном зачёте соответственно 1 место заняла Шерешевская СШ, 2 место – Линовская СШ. На 3 месте – юные бегуны СШ №5 г.Пружаны. Также очень хорошо выступили девочки из Бакуны-1, - это отметили тренеры Пружанской ДЮСШ.

В личном зачёте места распределились следующим образом. Среди юношей (1984-1985 гг. р.) 1 место, на дистанции 5000 м., завоевал Бармута Александр, на 2 месте - его брат Бармута Алексей (СШ №1). Среди девушек этой же возрастной группы - 1 место, на дистанции 3000 м., у Базыльчук Натальи (Шерешевская СШ). В средней возрастной группе (1986-1987 гг. р.), 1 место, в беге на 3000 м., занял Волков Денис (Шени), и 1 место, в беге на 2000 м., - у Мацкевич Натальи (Бакуны-1). Мальчики младшей возрастной группы (1988 г. р. и младше) бежали дистанцию – 2000 м., а девочки этого же возраста – 1000 м. Здесь лучшие результаты показали Линевич Дима (СШ №1) и Хмелевская Оля (Бакунская школа).

Голас Пружаны

Рэг. № 1323 ад 16.07.1999 г.

Заснавальнік і рэдактар Язэп Машкала

Адрас рэдакцыі:
225140, г. Пружаны, вул.Завадская, 16

Тэлефон:
(01632) 2-00-40

E-mail:
golasp@irex.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць асабістую адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў, іх меркаванні могуць не супадаць з поглядам рэдакцыі.

Рэдакцыя не вядзе перапіску з чытачамі і пакідае за сабою права рукапісы не рэцэнзаваць і не вяртаць.

Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах.

Падпісана да друку 12 кастрычніка 2000 года.

Час падпісання 18:00

Надрукавана ў Слонімскай узбуйненнай друкарні, г. Слонім, вул. Хлюпіна, 16.

Наклад 1000 экз. Заказ № 3215